ВОЛЬНЫЙ ТРУД
Белосток
11 АПР 40

# Новыя пастаноўкі другога Беларускага тэатра

Калектыў другога Беларускага драматычнага тэатра, які зараз знаходзіцца у Беластоку, дзейна рыхтуецца адзначыць новымі пастаноўкамі дэкаду беларускага мастацтва ў Маскве.

У сучасны момант у тэатры ідуць апошнія рэпетыцыі да пастаноўкі новай прэм'еры «Над Бярозай ракой». П'есу ў вершах спецыяльна для тэатра напісаў беларускі паэт-ардэнаносец П. Глебка.

Тэма п'есы — барацьба беларускага народа з белапалякамі і дзейнасць у гэтай барацьбе палкага большэвіка-рэвалюцыянера Серго Орджанікідзе. Ролю Серго выконвае заслужаны артыст рэспублікі тав. Звездачотаў. Пастаноўшчык новай прэм'еры — мастацкі кіраўнік тэатра тав. Аксёнаў.

Затым тэатр будзе працаваць над п'есай Пагодзіна «Крэмлёўскія куранты». У гэтай пастаноўцы выведзены вобразы таварышоў Леніна, Сталіна, Орджанікідзе.

Зараз маладзёжны калектыў тэатра працуе над драматычным творам «Блытаніна» Лопе дэ Вега. Тэатр трымае цесную сувязь з беларускімі пісьменнікамі і драматургамі. Драматург Вольскі заканчвае для тэатра п'есу «Несцерка», Кузьма Чорны піша драму аб вызваленні народаў заходніх абласцей БССР ад прыгнёту польскіх паноў.